

Свято Купалава Дому

...a dola duch dobr iola
...p. A, Pomnite byta
...
... mianio Aý maianta
... Dola Aý ...
...
... kanaje Aa...
... mnie ...
... [illegible]

... Kudy, ... ni ...
Kap chao' ... ...
Duch kali ni ...
Dola maja ... ...
I unio mnio
Kan

А ты, сірацінка, ...
...А ты, сірацінка, ...
Як ветрам лісток адарваны,
Ні маёнтка табе на зямлі,
Ні радасці з песень удаланых...
: свою долю кругом цень шукаць
...й — кругом ... бяз ...
... бог бяз ...

Ад прадзедаў і бацьк...
Вялікая, багатая зям...
Граніц ніхто чужо...
Як бог адзін — яна ...

А як забудзь...
Забудусь чэго пр...
Мабыць, забран...
Я-ж сын яго —

x

Вось так ні то хоч...
Свайм, што бачу, ня...
Што чую — не бяру...
І што я знаю — ...

Спай...
Сян...
А як...
І сын...

Акоп...

Сярод ...
Знак ...
Умоў ...
З наве...

Мой цень.

Як прыйдзе дзень майго збаўлення,
С крывавых чэрнеў ...
А веру, прыйдзе ...
З іглы адвечнасці ...
І крыжам стане на ...
Маго цвіцця бл...

Бяз вок, бяз косці, ...
Сам крыж, на крыжы ...
І, ўвесь уздушаўшы ...
Пачнуць пачнё ўвесь а...
Мой шлях, якім шаў...
Які мне толькі ...

Пачну будзе, як арлі...
Дабіту сонцаў над ...
Таму з шчыцця ...
І нарэкаць, кляснуць, ня...
Што я, што мне ...
Ня будзе плакаць ...

Ня будзе нават узда...
Адно мо вернецца ...
Якім я цень ад ма...

А зязюлька кукавала...

Як на свет радзіўся Янка,
Як заплакаў многа-мала, —
Цела маці над калыскай,
І зязюлька кукавала:

Ку-ку-ку, пінь дакуку!
Сыні, саполіт, малынькі, куку, ку-ку!

Як падрос, ... Янка,
~~...~~ поле стала, —
~~...~~ на цемнічы край ...
І зязюлька кукавала:
Ку-ку, ку-ку, пінь дакуку
Пасві статак, куку, ку-ку.

вялікім
~~...~~ Як вырас Янка,
~~...~~
~~...~~
О зязюлька кукавала
Ку-ку, ку-ку, пінь дакуку,
Сві ... ку-ку.

Як на ... ...
~~Карай і ...~~ Янка
~~...~~
... на ...
Янка сеў, людзі жалі,
О зязюлька кукавала
Куку, куку, пінь дакуку,
Жалі будзем, куку, куку

Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы


Святло Купалава Дому



Мінск
1998

Шчырапаклонную ўдзяку шлем айчынным дбайцам, што пачулі праўдзівы голас Купалы, прычасціліся душой, думкай ды шчодраю рукою да вечнае нашае Існасці — быць і пачуваць сябе тут, на цёплай дзядоўскай зямлі, спадкаемцамі Вялікага Хараства і Святла.
Цяпер мы супольна, пад крылом Купалавай паэзіі, адольваем беларускі шлях разам з Вамі:

Тамара Мікалаеўна Дудко
(ААТ "Аліварыя")
Анатоль Афанасьевіч Арцюхоўскі
(ЗАТ "Завод безалкагольных напояў")
Мікалай Трафімавіч Бялко
(ВА "Крышталь")



І няма на свеце так вялікай меры,
І няма на свеце так каваных дзвераў,
Каб хоць на часіну ў будні, ці ў нядзелі
Беларусь са мною разлучыць пасмелі.

Янка Купала

З КУТКА ЖАДАННЯЎ

З цэлым народам гутарку весці,
Сэрца мільёнаў падслухаць біцця —
Гэткай шукаю цэлы век чэсці,
Гэта адно мне падпорай жыцця.

Песню стварыці ясну, як неба,
Ў кожнай з ёй хаце быць мілым гасцём —
Гэтакіх толькі скарбаў мне трэба,
Гэткім я толькі жыву пачуццём.

Што не загубяць крыўды жывую
Душу народа, што ўстане са сну,—
Гэткай надзеяй толькі жыву я,
Гэткую толькі чакаю вясну.

К яснаму сонцу з цьмы, з беспрасвецця,
К славе з бясслаўя ўсім нашым людзям —
Гэткай шукаю сцежкі на свеце,
Гэткаму богу і душу аддам.

За лепшу долю роднага краю,
За сваіх брацця ў святой барацьбе —
Гэтакай толькі смерці жадаю,
Памяткі гэткай чакаю сабе.

Янка Купала. 1912 г.

Вяршыня беларускага пісьменства

У кожнага народа сярод класікаў нацыянальнага пісьменства вылучаюцца постаці найгалоўныя, якія ўнеслі асаблівы ўклад у развіццё роднай літаратуры, мовы і культуры, сталі своеасаблівымі сімваламі самаго народа. У англічан гэта Вільям Шэкспір, у рускіх — Аляксандр Пушкін, у палякаў — Адам Міцкевіч, ва ўкраінцаў — Тарас Шаўчэнка, у амерыканцаў — Уолт Уітмен, у венграў — Шандар Пецёфі... У беларусаў такой постаццю з'яўляецца Янка Купала (Іван Дамінікавіч Луцэвіч; 1882 — 1942).

У пачатку XX ст. Янка Купала ў адным са сваіх першых вершаў «Я не паэта» (1905 — 1907 гг.) пісаў :

Кожны край мае тых, што апяваюць,
Чым ёсць для народа ўпадак і хвала,
А беларусы нікога не маюць,
Няхай жа хоць будзе Янка Купала.

Зразумела, малады паэт ведаў, што яшчэ ў XII-XVII стст. яго суайчыннікі вылучылі са свайго асяроддзя такіх выдатных асветнікаў, майстроў слова, як Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Францыск Скарына, Сімяон Полацкі і іншыя, якімі па праву мог ганарыцца «кожны край»; ведаў, што менавіта ягоная зямля нарадзіла сусветнавядомага паэта Адама Міцкевіча, які хоць і на суседскай, польскай, мове, але таленавіта уславіў, апеў родную Беларусь (пад традыцыйнай у той час гістарычнай назвай «Літва»). Не мог не ведаць ён і пра адраджэнне беларускай літаратуры ў XIX ст., пра кагорту беларускіх паэтаў-адраджэнцаў (а іх было ўжо звыш пяці дзесяткаў) на чале з Вінцуком Дуніным-Марцінкевічам (1808 — 1884) і Францішкам Багушэвічам (1840 — 1900). Дык чаму ж




тады — «беларусы нікога не маюць»? А справа ў тым, што паэт звяртаўся да сваіх суайчыннікаў, пераважная большасць якіх за тры апошнія стагоддзі жорсткай паланізацыі і русіфікацыі амаль цалкам страцілі сваю гістарычную памяць, дэнацыяналізаваліся, прычым настолькі, што сталі блытаць веру з нацыянальнасцю, называючы сябе то рускімі (праваслаўныя), то палякамі (католікі), а то проста тутэйшымі, не адносячы сябе ні да якой нацыі. З другога боку, усе беларускія паэты XIX стагоддзя не былі чыста беларускімі, бо пісалі (часткова або пераважна) і на іншых мовах — найперш польскай, рускай. Янка Купала першы з беларускіх пісьменнікаў-адраджэнцаў «песні пачаў пець той мовай убогай, якой пагарджаюць горка, нядбала», — першы пачаў карыстацца ў мастацкай творчасці толькі беларускай мовай. Паэтычнае хрышчэнне яго адбылося ў 1905 годзе, калі ў мінскай рускай газеце «Северо-западный край» (да 1905 г. царскі ўрад не дазваляў друкаваць ніякія беларускія выданні) з'явіўся яго верш «Мужык». Толькі праз год заявіў пра сябе першай публікацыяй другі волат беларускага слова Якуб Колас, яшчэ праз год — трэці, Максім Багдановіч... Гэтаксама Янка Купала раней за іншых выдаў і сваю першую кнігу паэзіі — зборнік «Жалейка» (1908). Першы зборнік вершаў Якуба Коласа «Песні-жальбы» пабачыў свет у 1910 г., «Вянок» М.Багдановіча — у 1913 годзе...

Зразумела, Янка Купала не зрабіў бы для літаратуры, культуры народа ўсяго таго, што зрабіў, каб не было побач з ім яго паплечнікаў, аднадумцаў-падзвіжнікаў. Гэта (апрача ўжо названых) Максім Гарэцкі, Змітрок Бядуля, Алесь Гарун, Цішка Гартны, Вацлаў Ластоўскі, Антон Луцкевіч... Аднак несумненна і тое, што сярод гэтай слаўнай плеяды беларускіх адраджэнцаў пачатку XX ст. Янка Купала стаў самай прыкметнай фігурай — і па моцы літаратурнага таленту, і па выніковасці творчай рэалізацыі гэтага таленту.







В. Шарanговіч. "А хто там ідзе? " Аўталітаграфія.



Я. Рамаvoўскі. Янка Купала на бровары. Аўталітаграфія.



Янка Купала. Вільня, 1914 .



А. Кашкурэвіч. Янка Купала ў Смаленску. (На пераломе). Графіка.

Калі талент даецца чалавеку ад нараджэння Богам ці прыродаю, то як распарадзіцца гэтым талентам — гэта ўжо цалкам залежыць ад самаго чалавека. Аглядаючы свой дваццаціггадовы творчы шлях, Янка Купала ў вершы «За ўсё» (1926) пісаў:

Я адплаціў народу,
Чым моц мая магла:
Зваў з путаў на свабоду,
Зваў з цемры да святла.

З путаў на свабоду, з цемры да святла... Гэткі шлях разам з беларускім народам прайшоў і сам паэт. Сын беззямельнага арандатара, затым — чорнарабочы бровара, бібліятэкар, супрацоўнік, а пасля і рэдактар першай легальнай беларускай газеты «Наша ніва» (1906 — 1915), народны паэт Беларусі (з 1925 г.) Янка Купала ўсюды і заўсёды быў з родным народам — і ў горы, і ў радасці. Менавіта гэта дазволіла яму «сэрца мільёнаў падслухаць біццё» («З кутка жаданняў»), стаць яскравым мастацкім летапісцам жыцця беларускага народа ва ўсе важнейшыя гістарычныя моманты першай паловы XX стагоддзя: у пераломны час рэвалюцыйных падзей у Расіі ў 1905 — 1907 і 1917 гг., у векапомны перыяд аднаўлення дзяржаўнасці Беларусі — абвяшчэння незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі (1918) і стварэння БССР (1919 — 1920), у нялёгкія гады сталінскага эксперыменту па пабудове камунізму, у радасныя дні ўз'яднання беларускага народа (1939), у самы змрочны першы год фашысцкай акупацыі Беларусі... Але Янка Купала быў не толькі мастацкім летапісцам народа. У розны час, у залежнасці ад абставінаў, тонкі і шчыры лірык станавіўся то паэтам-грамадзянінам, то прарокам, то філосафам, а то і ваяком «за долю, волю і народ». Ягоная творчасць не адно выяўляла рост сацыяльна-





палітычнай і нацыянальнай свядомасці беларускага народа, але і актыўна садзейнічала гэтаму росту, фармавала грамадскі ідэал, нацыянальную самасвядомасць — стала сцягам духоўнага адраджэння народа. Тое, што большая частка насельніцтва былога Паўночна-Заходняга краю Расіі з «тутэйшых», «рускіх», «палякаў» паступова стала беларусамі, усвядоміла сябе як народ, такі ж нармальны, як і астатнія славяне, тое, што народ захацеў заняць (і ўрэшце заняў!) «свой пачэсны пасад між народамі» — атрымаў дзяржаўнасць, а ў канцы XX ст. і дзяржаўную незалежнасць — ва ўсім гэтым вялікая заслуга Янкі Купалы. Сам гора́ча паверыўшы ў ідэю нацыянальнага адраджэння дзесяцімільённага народа, паэт запальваў гэтай верай іншых: «Арліным узмахам агняцветнай думкі аб нашай волі мы скінулі і патапталі даўгавечную брахню, — брахню, што Беларусі не было і няма. Сваім векапомным і магутным духам народным, што адважна сягае на сонца, мы паказалі свету, што Беларусь была, ёсць і будзе» («Прамова на 15-годдзі літаратурнай працы»). Бацька нацыі — ў гэтым найменні-перыфразе Янкі Купалы няма перабольшання.

Час, абставіны абумовілі некаторыя, на першы погляд, парадаксальныя акалічнасці ў жыццёвай і творчай біяграфіі песняра. Дакастрычніцкая бедната і цемната, трагічныя сямейныя абставіны (у прыватнасці, у 1902 г. адначасова паміраюць бацька, брат і дзве сястры Янкі Купалы, ён становіцца галоўным кармільцам вялікай сям'і), здавалася, угатавалі таленавітаму юнаку, ды і то ў лепшым выпадку, долю мужыцкага вершаскладальніка, нікому невядомага аўтара фальклорных твораў. Сёння Янку Купалу, народнага паэта Беларусі, ведаюць, бадай, ва ўсім свеце, яго творы чытаюць на роднай мове дзесяткі нацый і народнасцей.

Былы царскі расійскі лад зрабіў усё для таго, каб нашчадак збяднелага шляхецкага роду Луцэвічаў эканамічна і





палітычна нічым не выдзяляўся з навакольных сялян, гэтак, як і яны, звычайным «вінцікам» быў навечна ўшрубаваны ў застарэлы механізм самадзяржаўя. Янка Купала разам са сваім народам стаў гаспадаром дзяржавы, адным з яе кіраўнікоў. Ён неаднойчы абіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларусі, членам яе вышэйшага выканаўчага органа (ЦВК БССР)...

Царызм пазбавіў паэта магчымасцей нармальна закончыць хаця б сярэднюю школу. Янка Купала самавукам, а таксама шляхам вячэрняй адукацыі (курсы Чарняева ў Пецярбурзе) набыў энцыклапедычныя веды, стаў правадзейным членам Акадэміі навук Беларусі (1928) і Украіны (1929), актыўным арганізатарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, шэрагу навуковых устаноў, нацыянальнага тэатра, рэспубліканскіх выдавецтваў...

Сацыяльная несправядлівасць і нацыянальны ўціск дарэвалюцыйнага часу асуджалі Янку Купалу з яго «мовай убогай» на ролю літаратурнага эпігона, пераймальніка «сваіх» і «чужых» літаратурных узораў. Ён жа ў ліку першых сфармаваў сучасную беларускую літаратуру і літаратурную мову.

Так, парадаксальнага ў жыцці і творчасці Янкі Купалы нямала. Гэтак, як і ў гісторыі ягонага народа, які, маючы ў сярэдневяковы час сваю магутную незалежную дзяржаву (Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае) з багатай культурай і дзяржаўнай беларускай мовай, урэшце страціў не толькі незалежнасць, але і дзяржаўнасць, на некалькі стагоддзяў заснуў летаргічным сном, каб у дваццатым стагоддзі заявіць усяму свету аб сваім прабуджэнні. І ў гэтым прабуджэнні роля Янкі Купалы, як і яго паплечнікаў — неацэнная.


З кожным годам усё большы прамежак часу аддзяляе нас ад тых дзён, калі жыў і тварыў геніяльны Янка Купала.



За марывам гадоў падчас цяжка ўбачыць вострую актуальнасць, надзённасць, тую ці іншую падзейную абумоўленасць асобных яго твораў. Аднак часавая адлегласць, разам з тым, дазваляе разглядзець многае з таго, што зблізку і не так заўважыш. Сёння шмат выразней, чым калі б там ні было, бачыцца агульначалавечая сутнасць паэзіі Янкі Купалы. Надзвычай глыбока заглянуўшы ў душу спачатку прыгнечанага, а затым сацыяльна і нацыянальна разняволенага селяніна-беларуса, ён тым самым стварыў аптымістычную кардыяграму «ачалавечання» чалавека-працаўніка. Такая кардыяграма набывае асаблівае значэнне ў кантэксце сацыяльнай і нацыянальна-вызваленчай барацьбы, якая вядзецца ў многіх месцах сённяшняй планеты.

Янка Купала паўстае перад намі і як арыгінальны паэт-філосаф са сваёй канцэпцыяй жыцця, месца і ролі чалавека ў ім. Мы, у прыватнасці, захапляемся канкрэтнымі перапетыямі, апісанымі ў паэмах «Курган», «Магіла льва», «Бандароўна», камедыі «Паўлінка», драме «Раскіданае гняздо», трагікамедыі «Тутэйшыя», убіраем у сябе шматлікія думкі, назіранні, эмоцыі, захаваныя ў гэтых творах. І мы, безумоўна, не можам прайсці міма такіх праблем, якія па-свойму ставіў і вырашаў народны пясняр Беларусі, як праблемы дабра і зла, сацыяльнай справядлівасці, жыцця і смерці, даравання і помсты... Альбо возьмем праблему выбару, што так востра ставіцца некаторымі сучаснымі пісьменнікамі (асабліва тымі, што пішуць пра другую сусветную вайну). Ці не праглядвае яна яшчэ ў «Кургане» Янкі Купалы? Думаецца, не толькі праглядвае, але і з'яўляецца адной з галоўных праблем гэтай глыбока змястоўнай паэмы.

Народны паэт Беларусі — выдатнейшы майстар паэтычнага слова, адзін з самых буйных паэтаў, якіх увогуле ведае сусветная літаратура. Калісьці ўкраінскі пісьменнік Максім Рыльскі пісаў :«Янка Купала быў невычэрпна



разнастайным у вершаванай форме, у яго мы бачым і творы, складзеныя зусім у духу народных песень..., і складаныя страфічныя формы, і зварот да такіх кананічных узораў, як актава,— але скрозь ён той самы Янка Купала : просты, шчыры, крышталына-ясны, сапраўдны народны паэт». Трэба ўлічыць, што Янка Купала не проста абжываў для беларускай паэзіі некаторыя, невядомыя раней, формы верша (напрыклад, санет, брахікалан і інш.), але і свядома ствараў новыя. Паэт узняў культуру беларускага верша на сусветную вышыню, як нікто з беларускіх паэтаў пасадзейнічаў тэхніцы вершаскладання, прыўнёс у беларускае і ўсё славянскае вершаскладанне свае рытмы, інтанацыі, накрэсліў найбольш перспектыўныя шляхі, якімі развіваецца зараз беларускі верш. Паэзія Янкі Купалы з'яўляецца сапраўднай школай майстэрства для ўсіх сучасных і наступных пакаленняў беларускіх пісьменнікаў.

Творчасць Янкі Купалы — нібыта шырока расчыненае вакно ў свет усёй беларускай паэзіі першай паловы XX стагоддзя. Адсюль, з акна Купалавай паэзіі, лепш бачацца не толькі тыя магістральныя шляхі, якімі ішла беларуская літаратура на працягу некалькіх дзесяткаў гадоў, а нават узбочныя дарогі і сцежкі. Відаць выразна і тое, што гэтыя шляхі пракладаў ніхто іншы, як Янка Купала разам з другім майстрам беларускага слова — Якубам Коласам.

Янка Купала непераўзыдзены знаўца народнага беларускага слова. Аўтар «Жалейкі», як слушна заўважыў яшчэ А.Луначарскі, прынёс у літаратуру «свой слоўнік, свае звароты, сваю паэтычную музыку проста з сялянскіх глыбінь, з цаліны народнай моватворчасці». У той час як Якуб Колас, чэрпаючы з тых самых крыніц, усё ж свядома ці падсвядома кантраляваў асноўныя лексічныя і граматычныя нормы сваёй мовы (яго настаўніцкая адукацыя не магла не выявіцца і ў гэтым), калі М.Багдановіч карыстаўся пераважна кніжнай

беларускай мовай, то моўная стыхія Янкі Купалы — гэта сінтаксічна гнуткае, лексічна багатае, інтанацыйна выразнае жывое народнае маўленне, якое часта ніяк не ўкладаецца ў пракрустава ложа сучаснай граматыкі. Янка Купала — яскравы прыклад сапраўды народнага паэта, які ўваскрашае ў памяці псіхалагічны тып старажытнага сказіцеля-баяна. І гэты прыклад тым больш знамянальны, што жыў такі баян не ў легендарныя часы «Слова пра паход Ігаравы», а ў XX стагоддзі, у касмічны век. Думаецца, творчасць, сама постаць Янкі Купалы з цягам часу будзе прыцягваць штораз большую ўвагу не толькі літаратуразнаўцаў, але і моваазнаўцаў, філосафаў, псіхолагаў...

З кожным годам далей і далей час, калі жыў і тварыў Янка Купала. Але з кожным годам мы ўсё больш і больш выразна бачым веліч песняра. І гэта не дзіўна: найвышэйшыя вяршыні можна разглядзець толькі з адлегласці.

Вячаслаў Рагойша
доктар філалагічных навук,
прафесар.







Янка Купала
ў Пецярбургу. 1912.



Янка Купала са студэнтамі беларусамі. Пецярбург, 1910.



Янка Купала сярод членаў беларускага літаратурна-навуковага гуртка студэнтаў С.-Пецярбургскага універсітэта пасля пастаноўкі «Паўлінки». 1913.



Янка Купала з Вацлавам Ластоўскім у рэдакцыі газеты "Наша ніва". 1913.



У МУЗЕІ ЯНКІ КУПАЛЫ

Ледзь крануўся я клямкі дзвярэй,
І рука задрыжала:
Нібы гэта зусім не музей,
А кватэра Купалы.

Хаця тут не страчаўся я з ім,
Знаю: з родным народам
Ён па краі ідзе дарагім,
Малады, як заўседы.

Толькі што-ж гэта там, у кутку?
Я падходжу, трывожны.
Бачу шапку яго на цвіку,
Плашч, кіёчак дарожны.

Я спакойны, бо знаю: ён жыў!
Гэта рэчы ў знямозе
Ён сюды, у куток, палажыў,
Сам-жа зноў у дарозе!

Кастусь Цвірка

Янка Купала і Ул. Ф. Луцэвіч. 1916 .



Я.Купала, У.Ф. Луцэвіч і С.К. Жывапісаў. 1916.

Святло Купалава Дому

Чалавек ідзе па жыцці, як дрэва расце ў прасторы і часе: коранем чэпка трымаецца долу, продкаў, а кронаю-думкай сягае ў вышу, у наступнасць. Чалавек жыве на Зямлі, прараставючы з мінуўшчыны ў невядомасць, творачы сваім лёсам, сваім шляхам Вечнасць. Чалавек ладуе на радзіме свой прытулак — гняздо, скуль узлятаюць у гісторыю нашчадкі, падсілкаваныя мудрасцю і моцаю папярэднікаў. Чалавек саграває жытло ўспамінам пра Дзядоў і мараю пра спадчыннікаў, асвятляе вокны сваёй гасподы-крэпасці сонцам надзеі і зоркаю Любові. Чалавек збудоўвае дом, як бажніцу: адасоблена ад людства, сам на сам да Бога, злітавана з родам-вытокам. Але кожным рухам і кожным учынкам, кожным уздыхам чалавек палучаны ў сваёй хаце-абярожніцы з грамадой, з Бацькаўшчынай, з Сусветам, бо толькі ў адзінстве-звязе з ваколлем і эпохаю спраўджваецца касмічная місія чалавека на планеце. Толькі ў злітнасці вызначаецца Адзінкавасць, Асабовасць, Непаўторнасць.

Чалавек-Творца раскрылены ў свет годным і чуйным птахам: яму чутныя ціхі боль і затоеная спадзеўка, бачныя непрыкметныя зрухі душы — душы сябра і незнаёмца, краіны і неабсяжжа, бытнага і мройнага. Чалавек-Творца сценамі свае хаты адгароджваецца ад мітусні і пустэльнасці, але судакранаецца з рытмамі свайго веку і свайго радзіннага Краю. Чалавек-Творца збірае ў трапяткім сэрцы згукі і водбліскі прамінулых эраў і будучых падзеяў, каб выткаць на вечнай аснове быцця ўзор сённяшняга свята-





адкрыцца. Ён пранікліва ўглядаецца ў цемрава ўчарашняга, аджылага, каб відушча прадчуць і прасвятліць прышласць. І Дом Творцы, нібыта карабель, гайдаецца ў міжчассі, сцвярджаючы сваім існаваннем-яваю ў свеце непарыўнасць часоў, пакаленняў, рэальнасцяў і прароцтваў. Дом Творцы збірае ў сабе Дух нацыі, Веру нацыі. Дом Творцы — пазнака на дарозе народа да свае Божае сапраўднасці, да свае значнасці і адметнасці пад небам спракаветным.

Паэт выбірае сваё зямное прыстанішча, сваё жыццядайнае радовішча не выпадкова — празорана. Каб веставаць голасам чыстым і праўдзівым пра Айчыну і народ, што маюць Сваё прызначэнне і пакідаюць Свой след на касмічных пуцявінах. Паэт зніто́ўвае сваёй думнасцю і ясназрокам памяць-грунт і мару-ўзлётнасць, каб не спынілася бруянне жывое вады-святла ад каранёў да кроны. Каб вольна дыхала адзіная неўміручая з'ява — Любоў.

У Доме Паэта раскута і ўпэўнена валадарыць Яе Вялікасць Гісторыя — рэч надзвычай цнатлівая, першародная, колькі б няшчырых рук яе ні мацалі і як бы зацята яе ні пераніцоўвалі, падладкоўваючы пад часовыя нікчэмныя патрэбы. Над шчодрым і распятым на крыжы Ўзнясення Домам Паэта раскрылілі літасцівыя рукі Любоў і Гісторыя — дзве гордыя Панны-берагіні, што ведаюць вялікі сэнс прышэсця нашага ў жыццё...

У Купалавым Доме штовечар запальваецца святло, як некалі, як заўжды, пакуль на гэтай сядзібе над сівою Свіслаччу ветла ўсміхалася людзям і нябёсам шляхетная хата, дзе мысліў і тварыў Паэт. Прыстанак той цёплы, што памятаў Паэтавы крокі, не





1-я зала. Дзяцінства і юнацтва Я. Купалы.



3-я зала. Пецярбургскі перыяд.



У. Тоўсцік. Год 1913, 9 лютага. Пецярбургская прэм‘ера.

пашкадавала, спаліла вайна. Гаспадару не суджана было вярнуцца дахаты са змушанай балеснай эвакуацыі. Гэтак і развіталіся ў ростані, праз адлегласць ад Масквы да Мінска, Паэт і Дом. Расхрыстана-роспачна зляцеў у лесвічны пралёт маскоўскага гатэля Народны паэт Беларусі. Скурчана-жальна згарэла ў прагавітым полымі вайны жытло, што гарнула да сябе сям'ю Паэта, крывіцкую радзіну і гамаккую адраджэнскую сябрыну, адкрытую, сумленную, і схаваную, прынароўленую да ўладарнага дзяржаўнага бязладдзя. Але... Паэты не сыходзяць у нябыт, не знікаюць. Паэты проста аддаляюцца, як зоркі на досвітку, каб ясней БАЧЫЦЬ. А зямля, дзе жылі яны і свяцілі, зберагае, як запаветныя знакі, сляды. Зямля занатоўвае ў летапіс Вечнасці спатканне паглядаў, поціск рук, лёт словаў, рэха крокаў.

У Доме-музеі Янкі Купалы, заснаваным у 1944 годзе, праз два скрушныя гады пасля смерці Мысляра, снуецца летапіс Творцы і Краіны, Творцы і радзіны, што прыгарнула-ўзгадавала талент...

Першы дырэктар, арганізатар і стваральнік музея — жонка Янкі Купалы Уладзіслава Францаўна Луцэвіч. Чалавек, які нястомна, самааддана, па кроплі-зернейку збірала спадчыну Песняра, параскіданую па ўсім свеце вайной, каб ужо з 20 верасня 1945 года музей прыняў наведвальнікаў. З таго часу з экспазіцыяй Дома-музея Купалы пазнаёміліся каля трох мільёнаў прыхільнікаў беларускае культуры.

І цяпер горача, несупакоена, упарта дыхае жыццё, складаецца доля Паэта — доля надпланетарная, вечная, не пазнаная дапытлівымі, але гэткімі недасканалымі насельнікамі Зямлі. Некалькі адрасоў




змяніў Літаратурны музей Янкі Купалы, пакуль абсталяваўся ў 1959 годзе ў новым двухпавярховым будынку на ўзбярэжжы Свіслачы, на папялішчы знішчанага вайною дома, дзе з 1927-га да 1941-га года жыў Паэт з сям'ёю — маці спадарыняй Бянігнай, жонкай Уладзіславай, сёстрамі і пляменнікамі.

Цяпер, як і заўсёды, цёпла ў Купалавым Доме — цёпла ад светлага ўспаміну, ад чуйнага дыхання Купалавых думаў-трывогаў, што не змарнелі, не загаслі на Бацькаўшчыне, якая ўзрушана-ўтрапёна паранейшаму чакае слова Прарока, Шукальніка-падарожніка. У Купалавым Доме не спынілася тахканне часу, быццам не суцішаў тут сэрцабой прыветных гаспадароў, гатовых прыняць людскую споведзь і людское маўчанне, выслухаць сяброў-аднадумцаў і зусім, здавалася, незнаёмых прышэльцаў. Таму і цёпла, праменна ў Доме-музеі, дзе маленькі акрайчык Айчыны зберагае дабрыню і чысцінь Паэтавых думаў.

У лагодных абдоймах вячыстых дрэваў угнездаваўся Дом-музей. З радаводнага веццяБожага Дрэва Вечнасці прабіваецца стромкая прысада — ад помніка Паэту да вачэй-вокнаў Дома, дзе напята трымцяць і цяпер атожылкі жывых Купалавых радкоў, вобразаў, паэтычных празарэнняў. Уся культура крывіцкага прадаўняга роду, якому было наканавана вырасці ў дзяржаву, ахвярна-дайна легла асновай на кросны часу, і з навою гэтых нястомных кроснаў бяжыць белая кужэльная сцяжына памяці. Сёння сцяжына памяці ўзбегла на прыступкі ганку Купалава Дому, і разнасцежыліся дзверы ў лёс, Край, век і храм Паэта, якія маліўся "небу, зямлі і прастору за родны загон Беларусі", маліўся пакутна, расплатна, узвышана і ўзнадзеена.



Янка Купала з удзельнікамі драматычнага гуртка Бабруйскіх педагагічных курсаў. Мінск, 1921.



Янка Купала сярод удзельнікаў Пленума Цэнтральнага бюро Усебеларускага аб‘яднання паэтаў і пісьменнікаў “Маладняк”. 1925.



1888



1904



1916



1917



1908



1910



1919



1923


1911



1913


1936


1941



Народны паэт Латвіі Ян Райніс і Янка Купала сярод беларускіх пісьменнікаў. Мінск, 1926 .



Янка Купала з чэшскімі пісьменнікамі І. Горам і Я.Кратахвілам у Карлавых Варах. 1927 .



Янка Купала з маці - Бянігнай Іванаўнай Луцэвіч.1929.

Дом-музей Народнага паэта, грамадзяніна, чалавека... Дом, з якога б'ецца трывожна і турботна відушчае сэрца Прарока. Дом-музей чалавечае бунтоўнае, непераможнае веры; Дом-скарбніца, у які па Божай волі прыходзяць звесткі-згадкі пра Купалу ды ягоных паплечнікаў, куды вяртаецца бязлітасна-раскрыжаваная праўда Адраджэння, асвечанага любоўю да роднае зямлі і параненага, скалечанага нашэсцем рэпрэсіяў. Дом-абярога Купалавых запісаў-занатоўкаў, рэчаў, што памятаюць дотык Паэта і вылучаюць ягоную светлавую энергію. Дом-спадзявальніца на здзяйсненне Паэтавых прадчуванняў, што "праўда возьме верх нязводне: Такі ўжо сонца вечны ход"... Дом-навучальня на творчасці Янкі Купалы ды іншых мастакоў-дбайцаў Беларусі жыць, любіць, спасцігаць сэнс і высокую місію чалавека, асобы, творцы ў планетарным і сусветным быцці. Дом-заклік абудзіць у сабе чуццё Радзімы, знайсці ў сабе той векавечны вузельчык, што звязвае ўсе пакаленні ў род-народ.

А спадчына — духоўны і матэрыяльны пасаг, што назапасіла дзядовая зямля, што пераняў, пераасэнсаваў, прыўкрасіў Паэт, чым жывіцца-сілкуецца душа зямлі, душа народа, — у Купалавым Доме багатая, заможная, вартая захавання, пакланенння і памнажэння. Тут, у скарбніцы Паэтавых пошукаў і адкрыццяў, знаходкаў і спавяданняў, турботаў і чалавечых нялёгкіх рашэнняў, "жывуць" і вястуюць сучаснікам пра лёс нацыі і лёс Творцы, пра гісторыю і мару, пра незалежнасць і пакорлівасць Божага Краю больш за 25 з паловай тысячаў асноўных фондавых адзінкаў. І ўсё гэта — не маўклівыя абыякавыя экспанаты, якім не знайшлося месца ці прызначэння ў дні сённяшнім. Усё гэта — ад саматканых





пасцілкаў, вышываных льняных ручнікоў і саламяных капелюшоў, якімі слынная Беларусь на ўвесь белы свет, да важкіх Дзяржаўных узнагародаў народнага Песняра і суровых дакументаў стагоддзя — сведчанне непарыўнага звязу сівое даўніны і надыходнае далечы, звязу ўсяе шматвяковае народнае культуры і творчасці Янкі Купалы, празорцы і адданага сына Бацькаўшчыны, задумнага Мысляра і адважнага воя "за волю, долю і народ". Усё гэта — яскравае сведчанне пашанотнага ўвекавечання памяці Купалы, памяці яго часу і яго аднадумцаў, прысланых Богам адрадзіць нягасную славу Айчыны, вывесці з паняволення высокі Дух спеўнае, годнае, мудрае, працавітае нацыі. Усё гэта — усходы і ўраджайнае калоссе збіральніцкай, навукова-даследчай, прапагандысцкай дзейнасці музея, няўтомнае руплівасці на ніве купалазнаўства, купаласпасцігальнасці, на вечнай ніве нацыянальнага гонару і самапавагі, з якое стромка прабіваюцца да жыцця парасткі новага мыслення, новага светабачання.

Гады клапатлівае працы навукоўцаў, Паэтавай жонкі Уладзіславы пасля смерці Купалы жыццядарна ўпалі зярнятамі ў сховішча памяці, каб аднойчы абудзіцца таямніцай Купалавай любові ці Купалавай роспачы. Каб аднойчы даслаць у Сусвет: "Гэта крык, гэта енк, што жыве Беларусь". І пераканана пацвердзіць помнікамі, музеямі, тэатрамі, што Беларусь і ўзапраўды, праз усе ліхалецці, войны, варажнечу і прыгнечанне, жыве — не згорбілася, не ўкленчыла перад хмарай адрачэнства і бязвер'я. Жыве і намацвае шлях павяртання да сябе існае — непахіснае, нескаронае, незагаснае зоркі ў паднебнай загадкавай бязмежнасці.









Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Вязынка».





Філіял музея «Акопы».







Адкрыцце помніка Янку Купалу ў Араў - парку каля Нью-Ёрка.1973.



Помнік Янку Купалу ў філіяле музея «Ляўкі». Скульптар А. Анікейчык.



55-я ўгодкі смерці Янкі Купалы. Вайсковыя могілкі. 28 чэрвеня 1997.

З Купалава Дому звяртаюцца да нас напамінам пра ўзлёт Крывіцкага Духу 1154 старонкі рукапісаў твораў Паэта, 52 копіі аўтарызаваных машынапісаў з творамі Купалы, друкаваны тэкст на правах рукапісу на 827 старонках, асабістыя дакументы і рэчы, звыш трох тысяч адзінкаў захавання фотаархіва, 180 адзінкаў кіна-, фота-, відэаархіва, 6 400 адзінкаў кніжнага фонду, 1 080 з якіх — з творамі Генія.

Учытваюся ў паспешлівыя запісы Паэтавай рукі, Паэтава жыцця, услухваюся ў інтанацыі голасу, данесенага часам, прасторай, дакранаюся да старое вокладкі пашпарта, выдадзенага Івану Дамінікавічу Луцэвічу ў 1907 годзе Мінскай мяшчанскай управай, гартаю пашпарт году гнеўнага, 1941-га... Прамінаючы сцежкі дзесяцігоддзяў, трапляю ў іншае вымярэнне, ГІСТАРЫЧНАЕ. Апынаюся ў іншых духоўных каардынатах. Жывымі чыннікамі Адраджэння прыходзяць, быццам хочуць дапамагчы, дарадзіць сёння, 5 000 кнігаў з Віленскай бібліятэкі-чытальні Даніловіча "Веды", перыёдыка з 1905 года (газета "Северо-Западный Край" 1905 г. з вершам Янкі Купалы "Мужык", падшыўкі газеты "Наша ніва" 1906 — 1915 гадоў) ды іншыя, асобныя нумары выданняў: "Лучынка", "Вольны шлях", "Современный мир", "Педагогический листок", "Маладняк", "Зоркі", "Малады араты", "Рунь", "Беларусь", "Полымя", лістоўкі і газеты Другой сусветнай вайны са словам Купалы, выданні пасляваенныя, паслякупалаўскія...

Скрозь пругкую падатлівую заслону часу ўваходжу ў долю Купалы, пазнаю чалавека, гаспадара, сябра, мужа — Купалу ва ўсіх вобразах, якія надыктоўвала яму непераможнае па сваім рэжысёрскім



таленце жыццё... Зазіраю сцярожка ў паўцёмную прымружаную залу бібліятэкі Даніловіча. Веды падказваюць: Купала тут, у Вільні, у 1908 — 1909 гадах працаваў бібліятэкарам, каб затым, у 1914, узначаліць "Нашу Ніву".


Вось і прыняла мяне стараладная, старасвятая Вільня — Вільня Вострае Брамы, Скарыны, Каліноўскага, карункавага касцёла святое Ганны, Вільня-сталіца моцнае гожае дзяржавы. Гэта з Купалава Дому прыйшла я да Вільні, да гонару, да Любові, якімі абярожна падпеpазаная гісторыя маёй зямлі. Гэта ў Купалавым Доме напаткала мяне адчуванне далучанасці да пачатку веку, да Пецярбургскае выдавецкае суполкі "Загляне сонца і ў наша ваконца", да студэнцкае вясёлае гаманы ў кватэры прафесара Браніслава Эпімах-Шыпілы, дзе кватараваў Паэт з 1909 да 1913 года падчас вучобы на Агульнаадукацыйных курсах А.С.Чарняева. Сапраўды, інтэр'ер Купалава пецярбургскага пакою, вакно ў таемны начны горад, крэсла і бюро з маскоўскага жытла мастака Елісеева, дзе часта гасцяваў Янка, — нібы прыадчыненыя веснічкі ў гаспадарства чалавечых паважных стасункаў, чалавечай прыцягнёнасці-замілавання, на якія быў майстрам Купала.

Далучаная да свету Купалавых зацікаўленняў, я разам з ім нібы ўваходжу ў Еўрапейскую супольнасць: гартаю любімыя Купалам кнігі Ул.Сыракомлі і Г.Сенкевіча, А.Міцкевіча і Ю.Славацкага, М.Канапніцкай і А.Ажэшкі, С.Пшыбышэўскага; гістарычныя раманы Ю.Крашэўскага. Іду ўпоравень з часам і зачытваюся сімвалістамі Л.Андрэевым, Ул.Салагубам і інш. Струменіць у маё і Купалава сэрца высокая паэзія рускіх М.Някрасава, М.Лермантава, А.Кальцова, А.Пушкіна,





Янка Купала сярод бліжэйшых супрацоўнікаў часопіса «Полымя». 1926.



Я. Купала, М. Зарэцкі, М. Чарот, Ц. Гартны. Прага, 1927.



Я. Купала, французскі пісьменнік Жан-Рышар Блок і украінскі драматург І.Качарга на 1-м Усесаюзным з‘ездзе савецкіх пісьменнікаў. 1934.



Я.Купала сярод пісьменнікаў і журналістаў у Браціславе. 1935.



Я.Купала, акадэмік М.Шчарбакоў і П.Галавач у Харкаве на адкрыцці помніка Т.Шаўчэнку. 1935.



Я. Купала і М.Лынькоў у в.Дразды пад Мінскам. 1936.



Я.Купала і Я. Колас. Цхалтуба, сакавік 1941.



Я. Купала, А. Фадзееў і А. Талстой. Масква, 1939.



Я. Купала выступае на ўрачыстым пасяджэнні, прысвечаным 1000-годдзю армянскага народнага эпасу «Давід Сасунскі». Ерэван, 1939.



Я. Купала сярод удзельнікаў 1-га Усеславянскага мітынгу ў час падпісання звароту да братоў - прыгнечаных славян. Масква, 1941.

украінскага Т.Шаўчэнкі. Духам і Розумам іду ўслед за Купалам ад "Северо-Западного календаря" да "Filozofii Historii Polskiej", спасцігаю-смакую літаратурную, філасофскую думку замежжа: Дж.Байран і У.Шэкспір, Г.Уэлс, І.Гётэ і Ф.Шылер, Г.Гаўптман, Б.Келерман, С.Сервантэс. Побач з Купалам паўстае безліч іменаў, строфаў, высноваў, азарэнняў-знаходкаў.

Варажбітнае крананне мінуўшчыны — дотык да ціхай торбачкі з зямлёю, што згарнуў на ростані Паэт, пакідаючы Радзіму ў першыя дні вайны: згарнуў, пэўна, у гаротным прадчуванні: болей не ступіць на родны змуравелы двор. Кардыяграмай ваеннае пары на сцяне графік дзяжурстваў па ахове дома ад запальных бомбаў па Вялікай Грузінскай вуліцы ў Маскве. У спісе пазначанае і прозвішча жыхара Янкі Купалы.

Дыханне паэтавай Дарогі пазнання затоена прыхавалася ў пакінутых рэчах, якія перажылі, абагналі чалавека ў часе: паліто, пінжак, кашуля-вышыванка, гальштук, прывезены з Чэхаславакіі, белыя валёнкі, падораныя чувашскімі рабочымі ў лютую зіму вайны.

Дакументы 30-х гадоў... Апякае слязою адчаю, несправядлівасці, надрыўнага душэўнага злому перадсмяротны ліст Прарока, насмеленага завяршыць жыццё па ўласным сумленным прысудзе, не прадаючы крыважэрнай рэпрэсіўнай машыне блізкіх, дарагіх іменаў.

Купала, Колас — два волаты, два светачы Адраджэння, закратаваныя ў высочваннях, падазрэннях, допытах. Закратаваныя ў страху перад самімі сабою, перад раскрытаю паэтычнаю душой, што не ўмее прыстасавацца да разбурэння, да рассячэння



думкаў і дзеяў, матэрыі і Духу.

... Кабінет Паэта: строгі, заценены надсвіслацкімі шапаткімі дрэвамі, авеяны подыхам творчасці, ахілены Божаю ласкаю і яснатою разумных, разважных папярэднікаў у прыгожым пісьменстве, якія пакінулі ў дар кнігі — лісціны Ісціны. У два вакны сочыцца жывіцаю святло.

А праз парог — усмешлівая, ветлая гасцёўня, куды сходзіліся павячэраць, пагутарыць, памудраваць над вершам і над рухам быцця паплечнікі Купалы, прыязнікі, наязджане ў Менск з усіх узнадзееных вясною Адраджэння куткоў Краіны. Аграмадны гасцінны стол, парцэлянавы посуд, стары нязмоўклы гадзіннік, тагачасны тэлефон, шахматы роўнымі шэрагамі на зграбным століку... Пераблытаныя, перавітыя мірнасць і неспакой, песня гасціны і сцятасць болю, любоў і гаркота. Сплеценыя ў вянок дзён-мігаў, нібы купальскія чароўныя зёлкі, шчасце еднасці і адчай адзіноты, зачын і завяршэнне — думаў, справаў, шляхоў.

Белае параненае птушанё апошняга Купалава ліста з Масквы, у конадзень 60-годдзя, — ліста да жонкі Уладзіславы Францаўны, якой суджана будзе жыць без Янкі 18 гадоў (памерла ў 1960 г.) дзеля ягонай несмяротнасці на Бацькаўшчыне і ў вялікім свеце. Дзеля святла праўды, якая адкрывалася Беларусі праз гэтага чуйнага чалавека, народжанага яснабачным Творцам. У паперах, азначаных таропкім почыркам Купалы, застылы летапіс спраўджанага, узвершанага жыцця. Над паперамі, над пачуццямі і памкненнямі — непазбежнасць скону, пералёту ў бясконцасць, з якое ўсё жывое прыходзіць на Зямлю. Мастак не выпадкова паставіў



сімвал Купалавай пагібелі-ўзнясення — белую пустацелую шахту, якая ўсмоктвае лёсы, — між кратамі рэпрэсіяў, барацьбой вайны і зычлівасцю гасцёўні. Усе мы — толькі госці на планеце, заклікаdébы выпесціць і прынесці ў дар будучыні сваю песню, сваю кветку. Але ў няволі і ў змаганні гінуць гасцінцы Сусвету, не прарастае зерне існасці. І толькі Геній пранізвае святлом сэрца скамянелыя ўпластаванні людскога рабства і прабіваецца скрозь нянавісць і злосць да Любові, на крыж якое азорана ўзыходзіць сам.

З тае ўкрыжаванае небам і зямлёю Паэтавай Любові, што мужным праменем праццяла час, вытканае сённяшняе жыццё Дома-музея — жыццё ў імя Купалы, у імя новае народнае Дарогі ў гісторыю, асвечанае паэтычнай праніклівасцю Купалы. А на гэтай нялёгкай паваротнай Дарозе засечкамі-падказкамі паўстаюць даследаванні, даведнікі, зборнікі матэрыялаў пра Песняра, падрыхтаваныя ягоным Домам-музеем: альбом "Янка Купала. Жыццё і творчасць", кнігі "Народны паэт Беларусі", "Такі ён быў", "Успаміны пра Янку Купалу", "Янка Купала ў беларускім мастацтве", "Янка Купала. Публіцыстыка", "Янка Купала: да 100-годдзя з дня нараджэння. Бібліяграфічны паказальнік", энцыклапедычны даведнік "Янка Купала", незлічонасць буклетаў, паштоўкаў, медалёў, радыё- і тэлеперадачаў, газетных і часопісных артыкулаў, выснаваных з экспедыцыяў-пошукаў і архіўных адкрыццяў.

На гэтай няспыннай Дарозе, па якой вядзе Радзіму відушчы Паэт, ладзяцца ўзнёслыя сустрэчы, да якіх здаўна прызвычаены Купалаў Дом, — святочныя спатканні з паэзіяй нашых знакамітых класікаў і сённяшніх пераемнікаў іхніх традыцыяў, — ладзяцца





ўрачыстыя бяседы гасцей айчынных і замежных, акрыленых найпершаю з'яваю свету — божым Словам.


Тут, у Купалавым Доме, распавядаюць пра Паэта і час, пра Паэта і Краіну 12 перасоўных выставаў, з якімі знаёмыя не толькі суайчыннікі Генія, але й насельнікі іншых краёў, куды завітвае творчая Дарога Паэта. "Янка Купала — Прарок Адраджэння", "Янка Купала ў беларускай графіцы", "Па купалаўскіх мясцінах", "Янка Купала і дзеці"... — россып назоваў выставаў, люботна зладаваных супрацоўнікамі Дома-музея, мовіць у свет пра магутнасць таленту Песняра, пра шматаблічнасць ягонага мыслярскага тварэння. Пра духоўныя далягляды Купалы, пра шчырасць і шчодрасць ягонай дружбы з творцамі іншых народаў, пра ягонае тонкае ўмельства паважаць чужыя норавы і думкі, пра свет і Космас у Купалавай душы разважае найноўшая выстава — "У сугуччы культур. Купала і Райніс". Праз вобразы Купалы пазнаюць нас суседнія этнасы, праз успрыманне Купалы адчуваем і мы роднаснае ці зусім далёкае мастацтва. Гэтак збудоўваюцца крышталёва-тонкія масты між культурамі Беларусі і Грузіі, Літвы, Латвіі, Расіі, Украіны, Чэхіі, Польшчы — масты між сэрцамі народаў, біццё якіх было пачутае Купалам.

Не суцішае і Паэтавае сэрца на радзімнай покуці. Вуснамі няўрымслівых маладых дойлідаў літаратуры прамаўляецца маленне Купалы: "Ў народ і край свой толькі веру І веру ў самаго сябе". І ў Доме-музеі па добрай старой завядёнцы прадзедаў збіраюцца грамадою наступнікі Паэта на спавядальныя даверныя вечарыны, што ўваскрашаюць гады прамінулыя і сягаюць натхнёна ў будучынь. Тут, у гойным атачэнні ўспамінаў, кніг, карцінаў, як старажытныя пісьмёны, перагортваюцца



дні Купалавых юбілеяў — публікацыя першага верша, выданне першае кнігі, пастаноўка першага спектакля, атрыманне першае ўзнагароды... Першыя знаёмствы, сустрэчы,ростані. Першае каханне і расчараванне. Першае ўсведамленне свае ролі, свайго месца ў гісторыі Краіны. Першыя памылкі і першы штуршок Вечнасці — горда-гаркотнае разуменне, што нічога не знікае ў нябыт, што ўсе ўчынкі і задумы занатаваныя памяццю Зямлі, памяццю Ўсясвету. У Доме Паэта паўтараюцца падзеі ягонага жыцця — цяпер ужо для нашчадкаў-спажывальнікаў душэўнае цеплыні і багацця, што струменяць з твораў Купалы, што мацавалі яго чалавечы лёс.

Адсюль крыляюць у бязмежнасць новыя паэтычныя зоркі, раскалыханыя на ўраганных хвалях Купалавых радкоў. Адсюль бяруць пачатак паўнаводныя рэкі паэтычных святаў, маладзёжных злётаў, дзён музея Купалы ў вёсках, у школах, гімназіях, універсітэтах. Тут, у маленькай паэтычна-прычашчальнай зале гамоняць і паўшэптава-заклінальна раздумваюць пра сэнс быцця непаўторныя вечарыны: "Лаўрэаты прэміі імя Янкі Купалы", "З песняю Купалы", "Купала і тэатр". Тут час ад часу ачышчальна плачуць празрыстыя свечкі па замучаных, катаваных Творцах Радзімы — Ларысе Геніюш, Уладзіміру Дубоўку, Уладзіміру Жылку, зорнай плеядзе "Маладняка". Да парогу Купалава Дому прыходзяць сённяшнія сейбіты Духу Генадзь Бураўкін, Ніл Гілевіч, Вольга Іпатава, Рыгор Барадулін, Валянціна Коўтун, Раіса Баравікова, Сяргей Законнікаў, Уладзімір Някляеў, Леанід Дранько-Майсюк, Сяргей Грахоўскі, Алесь Разанаў, Мікола Аўрамчык. З парога Купалава Дому бярэ ў вышу разбег Міжнародны фонд Янкі



Купалы, які распачаў цыкл вечарынаў-сустрэчаў “З Купалам у сэрцы”, выйшаў на ўсясветныя абсягі з імем і вершам Купалы, зрабіўся інтэлектуальным апірышчам традыцыйных купалаўскіх навуковых канферэнцыяў, на якія запрашаюцца даследчыкі-беларусазнаўцы з розных краінаў свету.

Пад сонечным дахам Купалава Дому сабрана ў адну непарыўную сям'ю каля 800 твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, што “запомнілі” Паэта яшчэ жывым (партрэты Купалы Дз.Полазава, Я.Кругера, замалёўка з натуры А.Бразэра, накіды К.Елісеева), альбо напісаныя на сюжэты Купалавых твораў ці прысвечаныя самому Творцу. Пад ахоўным дахам Дому — галерэя мастацкіх работаў, жывапісных, графічных, скульптурных, дрэваразьбярных, якія ўзнаўляюць, па-філасофску асэнсоўваюць Шлях Прарока, адоранага пакутай і шчасцем прадбачання, адмыкаюць містычнымі ключамі інтуіцыі Божае таемства, дзе нараджаюцца вобразы і героі, ідэі і матывы твораў непаўторнага і непадробнага Купалы — Паэта, філосафа, драматурга, публіцыста, перакладчыка. Пэўна, гэтая вечная непазнанасць Купалы вабіць да сябе мастакоў іншага кірунку і выяўлення: кампазітараў, спевакоў, рэжысёраў, актораў, тележурналістаў. У Доме-музеі зычліва прытуліліся навеяныя жыццём і творчасцю Купалы работы жывапісцаў І.Ахрэмчыка, А.Волкава. М.Савіцкага, П.Сергіевіча, А.Марачкіна, У.Тоўсціка, В.Цвіркі, графікаў В.Александровіча, М. і У.Басалыгаў, А. Кашкурэвіча, Я.Куліка, М.Купавы, Г.Паплаўскага, Я.Раманоўскага, В. і Я.Ціхановічаў, В.Шаранговіча, скульптараў З.Азгура, А.Анікейчыка, А.Бембеля, А.Глебава, У.Летуна ды іншых, хто







*Адкрыцце філіяла музея Янкі Купалы “Акопы”.
29 жніўня 1992.*

Ларыса Геніюш

Верны будзь слову,
якім Купала,
прарок народны,
сэрцы ўзварушыў.
Верны будзь слову,
якое ўпала
з матчыных вуснаў,
як з неба,
ў душу.



Анатоль Зэкаў "Зварот да Купалы"

Прыйдзі, пясняр, к нам на Купалле,
Прыйдзі, паглянь на нас і час.
А ці такімі сення сталі,
Якімі марыў бачыць нас?

Прыйдзі, паглянь на нашы кніжкі
І нам па шчырасці скажы:
Ці так, пясняр, мы сення пішам,
Ці ўсё, што пішам, будзе жыць?

Прыйдзі, пясняр, на момант нейкі,
Прыйдзі, агледзь хоць нейкі год?
Ці ўсе жывём трывогай веку,
Ці ўсе мы дбаем пра народ?

дакранаецца да Купалы тонкай душой у творчым супольніцтве. З Дома-музея бяруць пачатак Купалавыя песні, спектаклі, дакументальныя і публіцыстычныя фільмы пра Генія крывіцкае зямлі. З гэтага светлавокага Дому вышэе да Бога незамглёнае летамі шчымліва-ўзнёслае абуджальнае Слова.

Ад вясковай гасподы ў Вязынцы, дзе ў ноч на Купалле — 7 ліпеня 1882 г. — нарадзіўся Паэт, дзе ўдыхнуў першы глыток настоенага на верасе паветра, бальшак імкне да Акопаў — творчае калыскі класіка, а затым паварочвае да Ляўкоў, дзе на Дняпроўскай строме задуменна складаў Самога Сябе надламаны рэпрэсіўнымі трыццатымі Грамадзянін свае супярэчнае Дзяржавы.

Вязынка ажыўляе не толькі першыя Ясевы крокі па ўтравелым дзядзінцы, але трывожна нагадвае, што менавіта ад яе, ад кропкі з'яўлення ў свет, распачнецца блуканне Паэтавай сям'і па разбураных гнёздах, пачнецца беспрытульства чуйнае душы — чужынкі сярод сваіх, крэўных людзей. Вязынка першаю варожыць на добры шлях, на духоўны паратунак ад разбурэння найважнага гнязда — крохкае планеты Зямля. Таму этнаграфічная экспазіцыя, што разгортваецца ўлетку ў свіране, сціпла "прысаджаным" сярод вячыстых дрэваў, жыццясцвярджальна даводзіць-пераконвае: мы ўсе — зоркі сусветныя, пасланыя любіць і ствараць вакол сябе ды ў сабе Гармонію, мы ўсе — жывыя клеткі Космасу, што памятаюць вялікую Існасць Вечнасці, а Паэт — найтонкая ніціна лучнасці Краіны і Ўсясвету, учора і заўтра, прыроды і чалавека.

У Вязынцы бруіць прачысты ручай Пачатку. Каб у лысагорскіх Акопах, куды карцела Паэту вярнуцца і з



Менску, і з Вільні, і з Санкт-Пецярбурга з выспеленым пачуццём творчае прагі, узмацнела і расшчадрэла неадольная плынь паўнаводнае ўпэўненае паэтычнае ракі. Каб у Акопах выбухнуў суквеццем вершаў, паэмаў, драмаў, перакладаў незвычайны, невызначальны Купалаў талент. Пісалася тут гэтак, нібыта сам Пан Бог вадзіў думкаю і рукой! Нябачаны, нячуты ніколі цуд — па дзвесце, а то і па трыста радкоў у дзень. Вершаваная вышыванка, карункі паэмаў, драматычныя сутыкненні — усё клалася ў тканку несмяротнае літаратуры. Тут пабачылі свет камедыі “Тутэйшыя” і “Паўлінка”, вадэвіль “Прымакі”, драма “Раскіданае гняздо”, паэмы “Бандароўна”, “Магіла льва”, “Яна і я”, незавершаная “Гарыслава”, вершаваны пераклад “Слова аб палку Ігаравым”, гожыя каралі вершаў — больш за 80 твораў з пазнакаю “Акопы”. Пражытае, перажытае, можа, найвышшае сягненне самотнае душы, найвольнае дыханне яшчэ не раструшчанай, цэльнай думкі, памкнёнай да небакраю дасканаласці.

На леціішчы ў Ляўках, выштукаваным радзімнымі майстрамі, як залаты хорам, падараваным Народнаму паэту Беларусі дзяржаваю, якая ведала драпежныя подступы таптання-запалохвання і падзячнага ўзвышэння залежнага, прыніжанага, але не скаронага таленту, Янка Купала нанова ляпіў сябе-Асобу і свой Шлях. А Шлях, вядома, не ўквечаны перамогамі. Шлях, прагорклы слязінаю і даўкім дакорам самому сабе — неадменны шлях пакутніка.

...Прыпынялася жыццёвая хада Прарока і ў Пячышчах, бліз Казані, — станіішчы ў час эвакуацыі, дзе прагавіта, неспатольна лавіліся весткі пра запалоненую Радзіму, дзе быў зразуметы асабісты

жахлівы палон у астрозе сістэмы, што ўладарыла над лёсамі, душамі і шляхамі.

Цяпер у Доме-музеі Янкі Купалы і ва ўсіх яго філіях — у дзіцячай Вязынцы, мыслярскіх Акопах, одумных Ляўках, выпадкова-збярожных Пячышчах — заселеная самая непадкупная, самая нязломная , самая сутная з'ява ў касмічным бязмежжы — Паэзія. Засселеная жывая трапяткая неўміручая Прысутнасць Паэта, Прарока, Чалавека, Сына спакутаванага белага Краю, што плыве ад вытоку да вусця па рацэ Вечнасці, прасветла верачы ў Праведнасць і Лад, у анёльскае крыло Творчасці, якая заўжды ратавала, засланяла і давала моцы ЖЫЦЬ. Жыць, каб надзейна свяцілі вокны Паэтавага Дому сучаснікам, наступнікам і павяртаным да нас літасціва Дзядам. Жыць, каб ад мудрага Купалы ісці да Купалы вечнага, які дасылае нам з Нябёсаў новых Творцаў Беларускае Годнае Гордае Долі...

Антаніна Хатэнка



З КУПАЛАМ У СЭРЦЫ

Словы Сяргея Папара.
Музыка Міколы Яцкова.

Мы жывём на зямлі,
Дзе малітвы крыло
Да купальскай крыніцы з надзеяй прыпала.
Нас наведаў Купала - святло ажыло:
Прамяністаму Слову маліўся Купала.

П р ы п е ў:
Прытулак любові-
Купалаўскі дом.
З Купалам у сэрцы,
З Купалам у сэрцы жывём.

Нашай нівы вязьмо
На зажынкі заве.
Вольны вецер напеў вольных песняў нямала.
І хто быў на зямлі, і хто сёння жыве,-
На Купалу глядзіць. Нас вітае Купала.

П р ы п е ў.

Мы Айчыны сыны,
Мы сябры, грамада.
Свой пачэсны пасад зноў любоў адшукала.
Хай жыве Беларусь - як агонь, як вада!
У адвечнай хадзе Беларусь і Купала.

П р ы п е ў .

Янка Купала.

Словы У.Някляева. Музыка У.Будніка

ЗНІЧКА ЎПАДЗЕ НА ЗЯМЛЮ ВЕСНАВУЮ І ПРАРАСЦЕ ЗЯЕ ЗОРНЫ ПРА-

МЕНЬ. СЕЙБІТ ІДЗЕ, МЕСЯЦ У ВЫРАЙ ВЯСЛУ - Е, ТАК ПАЧЫНАЕЦЦА ЗАЎТРАШНІ

ДЗЕНЬ. СЕЙБІТ ІДЗЕ. ЁН ХА- ДЫ НЕ СПЫ- НЯ - Е.

ПОКУЛЬ ГУДУЦЬ ВЕСНАВЫЯ ЗВА- НЫ, ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ ПЕСНЯМІ ЁН ЗАСЕВА - Е,

КАБ НА ЗЯМЛІ КРАСАВА - ЛІ ЯНЫ. ЯНКА КУПАЛА ПЕСНЮ ЗЯМЛІ ЎСКАЛЫХАЛА.

ЯН - КА КУПА - ЛА ВЫСЕЯЛА ПЕСНЯ І ЎСТАЛА ЯНКА КУПА - ЛА ПЕСНЮ НА КРЫЛАХ ПАНЕСЛІ

БЕЛЫЯ ГУ-СІ. БЕЛЫЯ ГУСІ НАД РУССЮ НАД БЕ- ЛАЙ..

СВЕТЛАЙ ВАДОЙ З ГЛЫБІНІ Б'ЮЦЬ КРЫНІЦЫ ЗВОНЯЦЬ З ВЫШЫНЬ ВЕСНАВЫЯ ЗВАНЫ

А НАД ЗЯМЛЁЙ ПЕСНІ ЯК ЗЛОМ БЛІСКАВІ - ЦЫ НАД КУРГАНАМІ СІВОЙ ДАЎНІ-НЫ

ЯН - КА КУ - ПАЛА ПЕСНЮ ЗЯМЛЯ ЎСКАЛЫХАЛА ПЕСНЯ ЛУНАЛА ДОЛІ І ВОЛІ ШУ - КА - ЛА

ЯН - КА КУ - ПАЛА ПЕСНЮ Ў ВЫРАЙ ПАНЕСЛІ БЕЛЫЯ ГУ-СІ БЕЛЫЯ ГУСІ НАД РУССЮ НАД

БЕ- ЛАЙ!

АДРАСЫ ДЗЯРЖАЎНАГА ЛІТАРАТУРНАГА МУЗЕЯ ЯНКІ КУПАЛЫ І ЯГО ФІЛІЯЛАЎ

Музей і філіялы працуюць з 10 да 17 гадзін.

г.МІНСК вул. Янкі Купалы, д. 4; тэл. 227 - 78 - 66 (выхадны — пятніца)

Купалаўскі мемарыяльны запаведнік **"ВЯЗЫНКА"**

Мінская вобласць, Маладзечанскі раён; тэл. (8 - 273) 94- 552

з Мінска тэл. 294-08-40

Філіял музея Янкі Купалы **"АКОПЫ"**

Мінская вобласць, Лагойскі раён, вёска Харужанцы;
тэл. (8 - 247) 54 - 419

Купалаўскі мемарыяльны запаведнік **"ЛЯЎКІ"**

Віцебская вобласць, Аршанскі раён; тэл. (8 - 02161) 98 - 746

(у філіялах выхадны — панядзелак)

Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы.

«Святло Купалава Дому»

на беларускай мове

Складальнік — Дапкюнас Ж. К.

Аўтары тэкстаў — Рагойша В. П.
Хатэнка А. Я.

Каляровыя фатаграфіі — Цэхановіч А. Ч.

У буклеце выкарыстаны здымкі з фондаў Літаратурнага музея Янкі Купалы.

На першай старонке вокладкі Літаграфія Р. Сітніца. К лепшай долі з вялікай надзеяй.

prelúdium.

На крыжавых пуцінах з ёй спаткацца
Куды ісці не ведала яна
І я нех ведаў ў полі я ці ў лесе,
І мне мясцовасць [illegible] не адна.
К пушчы заблуканае ў ночы
[illegible] над [illegible] пашчай
і другому надзірані ў вочы
[illegible]
[illegible] Не відаць дзіва
[illegible] крыламі сваімі
[illegible] вачамі [illegible]
[illegible] сабе [illegible] вачамі.
[illegible]
[illegible] праз [illegible]

Прапор.

[illegible] народ насмешнікаў,
[illegible] к грудзям,
[illegible] пешчанай салодкай
[illegible] новаю к людзям.

[illegible] вецер [illegible] у вочы
[illegible] дзіцяне;
[illegible] плачам, як дзіцяне ў ночы,
[illegible] зубамі ўграло ў небе груканне.

[illegible] граніцаў;
не знаючы [illegible] на цэлоне;
[illegible] толькі із [illegible] граніцаў,
[illegible] сьвятая агонь.
[illegible] праўду

Душа [illegible] выкупная [illegible] сваім на [illegible]
[illegible] у [illegible] дзе
вам [illegible] у [illegible].

Дэпутаты і грамадзяне

Калі ў думу думаюць думы
Паны дэпутаты
І, як шырокі мяжа сабою
Апор [illegible]
Той крычыць: такія нам трэба
Ладаў і парадкаў!
Той [illegible] нічога —
Усё ў [illegible] ўладка!
Хто з іх праў, а хто не праўды,
Трудна адгадаці;
Адно толькі — грамадзяне
Ваюшыны маюць.

К-а.

...О так! Я — пралетар!..
Яшчэ учора раб пакутны
Сягоння я зямлі ўладар
І над царамі цар магутны
Мне бацькаўшчынай цэлы свет
Ад роднай ніў я адвярнуўся
І ўсё-ж [illegible]
Мне [illegible]